# Голас Радзімы

№ 9 (2099)
2 сакавіка 1989 г.

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ
(БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»)

Выдаецца з 1955 г.
Цана 4 кап.



ПЕРАД ВЫБАРАМІ

[«Дар—любіць людзей»]
Стар. 3

УНІКАЛЬНЫ ПРЫРОДНЫ КОМПЛЕКС

[«Ствараецца заказнік «Мазырскія лагчыны»]
Стар. 3

ПАСЛЯ ДВУХ СПАТКАННЯЎ З БЕЛАРУССЮ

[«На шляху да ідэальнага грамадства»]
Стар. 4

АДАМ БАГДАНОВІЧ: ЖЫЦЦЕ І ТВОРЧАЯ СПАДЧЫНА

[«Бацька паэта»]
Стар. 6






Растуць, добраўпарадкоўваюцца нашы вёскі. Усё часцей сустракаюцца ў іх гарадскія абрысы, і адначасова становіцца больш тонкай нітачка памяці, якая звязвае іх з сёламі мінулых гадоў. Аднавіць важныя складаемыя нацыянальнай спадчыны — дзе і як жылі і працавалі нашы дзяды і прадзеды—ужо больш дзесяці гадоў дапамагае спецыяльная рабочая група Міністэрства культуры рэспублікі. Нядаўна тое, што сабраў або і вярнуў да жыцця калектыў яе навуковых супрацоўнікаў, рэстаўратараў, мастакоў і рабочых, атрымала новы высокі статус — Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і быту.

Месца для музея пад адкрытым небам выбралі недалёка ад Мінска ў пойме ракі Пціч, каля вёсак Строчыца і Азярцо. Экспазіцыя яго складваецца з фрагментаў вёсак галоўных гісторыка - этнаграфічных рэгіёнаў рэспублікі. Распрацаваны планы і чарцяжы трох «залаў» — Палесся, Усходняга Палесся і Панямоння. А тыя, дзе размясціліся помнікі драўлянай архітэктуры і быту жыхароў Цэнтральнай Беларусі, Паазер'я і Падняпроўя, ужо прымаюць наведвальнікаў, якіх тут чакае многа цікавага.

НА ЗДЫМКАХ: з новымі паступленнямі працуюць навуковыя супрацоўнікі аддзела фондаў Т. ВАШКЕВІЧ і М. АЗОНЧЫК; прадметы сельскага быту; уніяцкая царква на тэрыторыі музейнай экспазіцыі Цэнтральнай Беларусі.



# Por una democracia sin escasez

LOS ánimos de la sociedad, al igual que los ánimos del individuo, suben o bajan en dependencia de las circunstancias. En los años de la perestroika nos tocó sobrevivir de todo: hubo iniciativas con las que aumentaron las esperanzas del ulterior mejoramiento del clima; hubo días duros en los que el desosiego caló en nuestras almas, porque creímos posible el retorno de los glaciares. Mientras tanto, la realidad parecía conducirnos por cierta línea central, sin mimarnos con cambios instantáneos, pero al mismo tiempo impidiendo que los viejos órdenes salieran de la clandestinidad.

Pero esta circunstancia, lógicamente, no ofrece un cuadro íntegro de los ánimos que reinan en la sociedad. Se debe tomar en consideración el trasfondo sobre el cual transcurre la campaña electoral. Se acumuló el cansancio psicológico. El esperado ascenso cualitativo de nuestra vida hasta el momento no se produjo. Es grande el déficit del presupuesto estatal, suben los precios y desaparecen las mercancías. Por supuesto, cada cual evalúa la situación a su manera. Pero también hay indicios manifiestos que nadie puede menospreciar: el tono de enfado que marcan las cartas enviadas a las redacciones de los periódicos, la alta tensión que reina en las colas y, lo que especialmente salta a la vista, las sorpresivas resoluciones en las recientes asambleas de nominación de candidatos a diputados del pueblo.

La palabra "sorpresivas", quizás, no sea demasiado adecuada para la lucha electoral. Pero la empleo por la siguiente razón. Parecía que las estrellas de primera magnitud en el cielo de la perestroika no tendrían rivales. Pero, de pronto, la académica T. Zaslávskaya no reúne la cantidad necesaria de votos en la reunión plenaria del Consejo Central de los Sindicatos Soviéticos. No acumularon el puntaje necesario para la nominación en la reunión ampliada de la presidencia de la AC de la URSS el académico A. Aganbeguián, el miembro correspondiente de la Academia P. Búnich, el doctor en economía N. Shmeliov... En las circunscripciones electorales territoriales, en las asambleas regionales, en su gran mayoría, obtienen el apoyo de la población los partidarios de cambios. Pero en las reuniones plenarias de algunas organizaciones de masas no llegaron a ser candidatos muchas conocidas personalidades. No hay que catalogarlos a todos como víctimas de los tejemanejes del aparato. Creo que la situación es mucho más complicada. ¿Qué quiero decir? Los nombres de estas personas están en la boca de todos, ya hace mucho y sólidamente se las identifica con el concepto de la perestroika. Son propagandistas activos y hasta autores de muchas de sus ideas. Y la actitud hacia estas personas equivalía a la actitud hacia la médula de los cambios. En una palabra, tras los resultados de la nominación de candidatos se trasluce una tendencia al descenso de las simpatías respecto de los "agitadores de ánimos", se pone en tela de juicio la propia posibilidad de los avances prometidos. Desde luego, en los resultados de la nominación repercutieron tanto los intereses de grupos como los enfrentamientos que aún continúan en los círculos intelectuales.

Hay comentaristas que consideran que el año pasado atravesamos las dos situaciones más duras de todo el período de la perestroika, cuando nos pusimos de cara ante la opción de "lo uno o lo otro", y fue en la primavera al publicarse la carta de Nina Andréeva y al inico del otoño, en vísperas del Pleno del CC del PCUS cuando se produjeron considerables cambios en la dirigencia partidista del país. Aquella primavera fue precedida por los bombardeos contra el único blanco marcado con especial empeño: el vanguardismo político. Es sabido lo que sucedió después. Pero a comienzos de otoño el pensamiento crítico aún no se había restablecido del choque recibido en las duras acometidas que en el verano se hicieron contra la transparencia y la crítica. Y los conservadores otra vez intentaron unirse codo a codo.

Los gritos de mutuos reproches pueden volver a impedir a las fuerzas de la perestroika escuchar la señal de peligro. No es momento para airarnos y ajustar cuentas. Hoy es la etapa de consolidación, de lucha tenaz. Transcurren asambleas electorales, y hay que luchar por el triunfo de los partidarios de la renovación. Es mucho, por no decir todo, lo que dependerá de la composición del congreso de diputados del pueblo de la URSS.

**Mijaíl POLTORANIN.**

# Apoyo total

Hasta el momento no hemos logrado deshacernos del estilo, las costumbres y los hábitos viejos. Lo nuevo, propio de la perestroika, no ha desplazado por ahora del todo lo que heredamos de la época del estancamiento, el culto a la personalidad, la falta de derechos y el temor. Lo más importante es que la gente que vive hoy es la misma de hace cuatro años, y su bagaje espiritual se formó en aquella época.

El comienzo de la perestroika fue prematuro. Por cierto, debería haber comenzado aún antes, pero el pueblo todavía no ha tomado conciencia de que el país se encuentra en un atolladero. "Es tolerable, se puede vivir": con esta máxima filosófica nuestro pueblo hubiera podido ir tirando largo tiempo. Uno de los rasgos de la conciencia masiva, arraigado profundamente en el alma del pueblo como resultado del estalinismo y el estancamiento, era la apatía total y el deseo de adaptarse, sobrevivir, existir como los demás; lo principal era que las cosas no marcharan peor. Eran obedientes modestas personas y escasa individualidad. El ideal, al cual aspiraba el sistema, fue casi logrado: un apoyo total a éste.

Para mediados de los años 80, el pueblo aún no había entrado en abullición, la mayoría todavía tenía lo que perder. Para la perestroika no habían madurado las condiciones. La comenzó desde "arriba" un grupo más perspicaz y valiente del partido. En esto consiste su ventaja: el carácter consecuente de su política, la existencia de un plan estratégico, la actitud enérgica. Mas, en esto también radica su debilidad: la escasez de la comprensión, del interés y del apoyo masivo.

Suelen decir que "el país se encontraba en un estado precrítico", que "nos habíamos aproximado al borde del abismo", por lo cual las fuerzas sanas del partido y la sociedad asumieron la responsabilidad de cambiar el rumbo, ya que no había otro camino. Lo paradójico consiste en que la crisis económica no ha sido superada hasta el momento, mientras que ahora un número creciente de personas percibe las dificultades justamente como una crisis, considerando los problemas heredados de la época del inmovilismo, que sacó a relucir la perestroika, como propios de esta última.

¿Hubo otros caminos en 1985? Sí, los hubo. Primero, el estancamiento podía haber durado aún largo tiempo. Se hubiera necesitado un lapso más prolongado para que todo se derrumbara de una vez. Se podría haber realizado reformas cosméticas para erradicar las deformaciones más evidentes y tratar de elevar el nivel de vida, al menos, hasta el de los países socialistas de Europa. Esto fue lo que comenzaron a practicar inmediatamente después de la muerte de Brézhnev.

Hemos optado por la tercera vía: la de una brusca y dolorosa destrucción de todo lo viejo, habitual, que funcionaba a la buena de Dios. Cuando a un enfermo le dicen que lo van a operar, no cuenta con ninguna garantía, le aguardan solo el temor y el dolor.

La perestroika es una revolución, y **la revolución jamás hizo feliz a todo el mundo de una vez.** Contra ella no intervienen elementos separados, sino capas y grupos de gente que no quieren la perestroika y son perjudicados por ella: la burocracia, los de la economía sumergida, la mafia comercial. Uno de los mitos de los últimos años es el apoyo masivo de la perestroika, como solía ser antes: "de todo el pueblo". Algunas de las encuestas, supuestamente científicas, de la opinión pública indican la cifra del 70 e, incluso, 90 % de los partidarios de la renovación. Pero esto es solo para los demasiado crédulos.

La perestroika avanza de manera más difícil y dolorosa de lo que se esperaba. Cada vez más se puede escuchar pronósticos alarmantes: si en los próximos dos o tres años no mejora la situación material de la gente, será socavada la fe en el partido y el gobierna, en la vanguardia de la perestroika.

Otra de nuestras paradojas consiste en que en adelante la situación económica será en parte más difícil, pero ya no podemos volver atrás. Es importante que se despierte la mayoría silenciosa, acostumbrada a vivir como vive, que tomen conciencia de que en el país reina un desbarajuste, que hay que cambiar todo, que es imposible hacerlo sin su participación. Para ello esta gente debe querer vivir mejor; no entregarse a los sueños, sino llegar a comprender que están viviendo pobremente y mal acomodados, que a fines del siglo veinte, en el país tan rico como el nuestro, todo el mundo puede, como los cooperativistas. ganar mil rublos al mes; tener agua corriente y teléfono en su casa; vivir con su familia en cuatro habitaciones y no disponer de 4 metros cuadrados de superficie habitable per cápita; llevar a sus niños a la escuela por la mañana; si es internado en un hospital, estar en la sala y no en el pasillo; caminar por asfalto y no por el fango. Todo esto hay que comprender y enfurecerse consigo mismos y con los demás, con el orden existente y con el sistema.

**Nikolái POPOV,**
*doctor en Historia, sociólogo, colaborador del Centro Nacional de Estudios de la Opinión Pública*



*En el pequeño poblado Ruba, cerca de Vitebsk, trabaja María Jákovlevna Chumanijina — directora general de la Asociación industrial "Dolomit". Hace once años que ella dirige esta gran empresa, la que ocupa las primeras posiciones no sólo en la república, sino en todo el país, dando anualmente como beneficios nueve millones de rublos.*
*Cada empresa de la Asociación tiene sus comedores y salas de descanso, saunas con piscinas y salas de entrenamiento, sus viviensanatorios-dispensarios. Pero lo más importante son las viviendas. En los últimos años los trabajadores de "Dolomit" han recibido 900 apartamentos.*

*María Chumanijina es miembro del Comité Central del Partido Comunista de Bielorrusia, laureada con el premio del Soviet de Ministros de la URSS, presidente del Consejo de directores de Vitebsk. Pero lo que más enorgullece a María Yákovlevna es la medalla por el Humanismo y la Caridad que lleva el nombre de Pirogov.*

*María CHUMANIJINA con su madre, María Nikoláevna.*
*Foto: A. TSERLUKEVICH.*

## "LA SEGUNDA VIDA DEL MARISCAL DE CAMPO PAULUS"

**Así se titula la novela documental, que pronto verá la luz en la Editorial de la Sociedad de Voluntarios para la Colaboración con el Ejército, la Aviación y la Flota de la URSS. Los autores de esta obra son Alexandr Blank, doctor en Historia, y Boris Javkin, candidato a doctor en Historia.**

Como es sabido, el mariscal de cmapo Friedrich Paulus, comandante del 6º Ejército de la Wehrmacht, el 31 de enero de 1943 fue hecho prisionero en el sótano de un almacén en Stalingrado. Primero lo trasladaron a Krasnogorsk y, luego, en abril de 1943, a Súzdal, donde tras los muros del Monasterio de San Salvador y de San Eufimio había un campo de concentración de prisioneros de guerra alemanes. Un testigo ocular de la vida de Paulus en el cautiverio fue el oficial de contraespionaje Alexandr Blank, quien trabajaba de intérprete militar. Su nombre se menciona, por ejemplo, en la biografía del primer presidente de la RDA, Wilhelm Pieck: Blank lo acompañó durante sus viajes a los compos de concentración de prisioneros de guerra.

Después de la guerra Alexandr Blank se convirtió en uno de los principales germanistas soviéticos, fundó y encabezó la escuela científica de la historia del fascismo y la lucha antifascista. Es autor de más de cien obras. ,

La novela corta "La segunda vida del mariscal de campo Paulus" se basa en un amplio círculo de fuentes y materiales históricos de la URSS, la RDA y la RFA, así como documentos poco conocidos y memorias.

,En 1979, la novela fue editada en la RFA con el título de "Prisioneros de guerra alemanes en la URSS", y suscitó una tormenta de indignación por parte de un grupo de diputados del Bundestag, quienes exigían que se prohibiese la difusión del libro "prosoviético" en la RFA. Más tarde esta novela, pero ya bajo el título de "La segunda vida del mariscal de campo Paulus", vio la luz en Checoslovaquia y Bulgaria. "¿Para qué hacer la publicidad en la URSS a un mariscal de campo fascista?", afirmaban algunos editores, argumentando así su negativa de publicar en nuestro país este libro.

Mas los tiempos han cambiado. El sueño de Alexandr Blank está por realizarse. Para ello contó con la ayuda de Boris Javkin, su discípulo, continuador y coautor. Ha llegado la hora de publicarse la novela en ruso.

**Natalia ROMANOVICH.**

**Redactor de la "Página en español": Demetrio OKULIK.**

## ЁН БЫЎ САПРАЎДНЫМ ВУЧОНЫМ СВАЙГО ЧАСУ

# БАЦЬКА ПАЭТА

«...Бацька паэта (мой тытул у Беларусі)»,—напісаў у лісце ад 4 мая 1929 года да аднаго з выдаўцоў дарэвалюцыйнай беларускай газеты «Наша Ніва» А. Луцкевіча вядомы беларускі этнограф Адам Ягоравіч Багдановіч. У словах гэтых і гонар за любімага народам сына — паэта Максіма Багдановіча, і горыч ад непрызнання сваёй навуковай дзейнасці.

Лёс будучага вучонага склаўся нялёгка. Нарадзіўся ён 25 сакавіка 1862 года ў мястэчку Халопенічы Барысаўскага павета Мінскай губерні. Бацькі былі сялянамі з панскіх прыгонных. Бацька яго, Ягор Лявонавіч, служыў у пана поварам і, як дваровы, зямельнага надзелу не меў, атрымаў пасля рэформы 1861 года толькі паўдзесяціны прысядзібнай зямлі.

Вучыцца маленькі Адам пачаў з 6 гадоў у вясковай школе, дзе дамарослы бакаляр з сялянскіх хлопцаў пад некаторым доглядам мясцовага дзяка вучыў хлопчыкаў чытаць па складах і пісаць мелавым чарнілам на драўлянай дошцы. З сямі гадоў пайшоў на работу — саджаць бульбу. У дзевяць гадоў быў ужо падзёншчыкам у панскім маёнтку. Гэта ўлетку. Па зімах працягваў вучыцца ў школе, дзе з 1870 года пачаў працаваць настаўнік з семінарыі. Настаўнікаў-семінарыстаў змянілася тры. Апошні навучаў гісторыі і геаграфіі. Выдатна скончыўшы ў 1874 годзе школу, Адам Багдановіч атрымаў пасведчанне, у якім было сказана, што ён «скончыў поўны курс навук». З таго часу Адам Ягоравіч вучыўся ўсё жыццё самастойна па кнігах, паміж спраў.

Адаму было няпоўных 13 гадоў, калі ён выйшаў з сям'і на самастойную дарогу. З таго часу ён быў вучнем чыгуначнай майстэрні ў прывакзальным мінскім дэпо, зіму бакаляры ў якасці памочніка настаўніка ў школе, якую скончыў сам, пасля быў вучнем у мінскага кандытара. Працуючы, ён увесь час многа чытаў і вучыўся сам. У 1879 годзе паступіў у Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю, каб атрымаць дыплом. Скончыўшы яе, з 1882 года чатыры гады настаўнічаў на вёсцы, пасля 6 гадоў у Мінску. Ён не хацеў пакідаць вясковую школу, але павінен быў пераехаць у Мінск на патрабаванню Мінскай кіруючай групы партыі «Народная воля», членам якой ён быў з 1882 па 1892 год (да поўнай ліквідацыі партыі пасля Лапацінскага правалу). Адам Багдановіч з'яўляўся сувязным звяном паміж Мінскай арганізацыяй і групай народных настаўнікаў. У Мінску А. Багдановіч быў загадчыкам і настаўнікам у гарадскім вучылішчы, а ў вячэрніх гадзінах выкладаў усе прадметы агульнаадукацыйнага курса ў яўрэйскім рамесніцкім вучылішчы. Адначасова кіраваў некалькімі падпольнымі гурткамі самаадукацыі — афіцэрскім, жаночым і рабочым. У Мінску пачаў вывучаць замежныя мовы: французскую, польскую, лацінскую, грэчаскую і пад канец жыцця — старажытнаяўрэйскую.

З 1884 года ў Гродне пачалі публікавацца навуковыя работы Адама Ягоравіча па этнаграфіі. За час жыцця ў Гродне (1892—1896 гады) ён змясціў нямала артыкулаў і рэцэнзій па пытаннях літаратуры і тэатра ў газетах «Минский листок», «Виленский вестник», «Гродненские губернские вести». У кнізе П. Шэйна «Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо - Западного края» апублікаваны тэксты казак і легенд, запісаны Адамам Ягоравічам ад сваёй бабкі Рузалі Осьмак.

Дзесяць гадоў маладосці былі перыядам напружанай працы. Сын Адама Ягоравіча Павел у біяграфічным нарысе пра бацьку, машынапіс якога захоўваецца ў мяне, пісаў: «Лёгка сказаць «быў членам партыі «Народнай волі». А гэта ж значыць перажываць усё тое, што з гэтым звязана, і перажываць у той перыяд, калі справы партыі ішлі на спад, калі пачыналіся правал за правалам, перажываць такія буйныя рэнегацтвы, як рэнегацтва Ціханава і іншыя, перажываць апошнія дні паміраючай партыі, калі яна аказалася без галавы, калі цэнтр ужо не існаваў, а перыферыя працавала, не падазраючы, што яна працуе без цэнтра. Усю работу даводзілася весці ў атмасферы вобыскаў і арыштаў...»

Стары мінчанін Леанід Тарановіч, пенсіянер, былы раённы ўрач, які добра ведаў Адама Ягоравіча, расказваў мне ў пачатку 70-х гадоў, што са слоў самога Багдановіча ён ведаў аб тым, што шрыфты падпольнай народніцкай друкарні той асабіста патапіў у сажалцы Губернатарскага саду (зараз — парк імя Горкага), а друкарскі варштат скінуў у Свіслач з моста на Гарбарнай (зараз Першамайская вуліца).

Павел Адамавіч пісаў пра бацьку: «У выніку гэтай напружанай работы ў А. Багдановіча пайшла кроў горлам і пачалі развівацца сухоты. Па прадпісанню ўрачоў, пад пагрозай хуткай смерці ён павінен быў пакінуць педагагічную дзейнасць, развітацца са сваёй любімай справай, якой марыў прысвяціць усё жыццё. Развітаўся разам з тым і з рэвалюцыйнай дзейнасцю, вырашыўшы ў далейшым займацца толькі культурнай работай,.. а затым усё жыццё заставаўся ў строгім сэнсе беспартыйным».

З'яўляючыся народнікам па нораву, сімпатыях і перакананнях, ён шукаў такой службы, каб мець сталыя сувязі з народам і працаваць для народа. Таму ўладкаваўся ў Сялянскім банку, дзе працаваў да 1920 года. Працаваў таксама ў Гродне (з 5 чэрвеня 1892 года па 1 кастрычніка 1896) на пасадзе памочніка бухгалтара, у Ніжнім Ноўгарадзе — на пасадзе спачатку бухгалтара, а потым правадзейнага члена (з 15 студзеня 1902 года), з 1907 года — у Яраслаўлі на пасадзе правадзейнага члена, з 26 ліпеня 1918 года да 1 лютага 1920 — кіраўніком Яраслаўскага аддзялення Сялянскага банка. Сын Адама Ягоравіча Павел пісаў: «За 28 гадоў работы па Сялянскаму банку пры яго дапамозе і садзейнічанні, у якасці ацэншчыка і землеўпарадчыка, перайшло ў рукі працоўнага народа звыш 400 тысяч дзесяцін памешчыцкай зямлі».

Рэвалюцыя застала Адама Ягоравіча ў Яраслаўлі. Пасля рэвалюцыі ён быў прызначаны кіраўніком Яраслаўскага аддзялення Сялянскага пазямельнага банка. На яго лягла вялікая работа па ліквідацыі аддзялення.

З 1-га снежня 1920 года ён пачаў загадваць Навуковай бібліятэкай Гістарычнага музея ў Яраслаўлі, дзе зрабіў навуковае апісанне старажытных рукапісаў і склаў сістэматычны каталог. Адначасова з работай у бібліятэцы выкладаў у розных навучальных установах Яраслаўля. 25 лютага 1931 года выйшаў на старасці на пенсію, спачатку акадэмічную, пасля персанальную. Апошнія гады свайго жыцця прысвяціў навуковай працы.

Памёр 16 красавіка 1940 года ад запалення лёгкіх.

Няпростым быў шлях Адама Ягоравіча ў навуку: большая частка яго даследаванняў засталася неапублікаванай. Працаваў у цяжкіх умовах. Сямейныя абставіны і грамадская праца не дазвалялі яму многа часу аддаваць навуковым заняткам.

У 1885—1892 гадах, загадваючы гарадскім пачатковым вучылішчам у Мінску, ён актыўна ўдзельнічаў у рэвалюцыйным руху, быў адным з кіраўнікоў мінскіх народавольцаў. Усё жыццё прайшло ў клопатах пра кавалак хлеба. Трэба было карміць мнагадзетную сям'ю.

У Ніжнім Ноўгарадзе Адам Ягоравіч пасябраваў з Аляксеем Максімавічам Горкім і хутка парадніўся з ім, ажаніўшыся з Аляксандрай Волжынай, сястрой Кацярыны Пешкавай.

З часам сям'я Багдановічаў усё павялічвалася. Дзеці пачалі хварэць на туберкулёз. Бацька спрабаваў уратаваць сыной і амаль штогод вывозіў іх у Башкірыю на кумыс або ў Крым. Жыла вялікая сям'я толькі на заработак бацькі.

Пасля ліквідацыі ў 1920 годзе зямельнага банка Адам Ягоравіч загадваў Навуковай бібліятэкай пры Яраслаўскім гістарычным музеі, а таксама чытаў лекцыі па гісторыі культуры і тэатра ў Яраслаўскім мастацка-педагагічным і музычным тэхнікумах.

Чалавек выключна дзейны, ён на працягу ўсяго жыцця вёў актыўную грамадскую і асветніцкую працу. З пачатку 20-х гадоў задумвае свае асноўныя навуковыя працы. Аб гэтым сведчаць яго пісьмы да А. Луцкевіча, што знаходзяцца ў рукапісным аддзеле Навуковай бібліятэкі АН Літоўскай ССР у Вільнюсе, а таксама перапіска (захоўваецца ў мяне) з пляменніцамі і ўнучкай.

У пісьме ў Вільню ад 7 студзеня 1929 года Адам Ягоравіч паведамляў, што ён ужо напісаў два раздзелы ўспамінаў пра народавольцаў Беларусі, але пакуль не мае магчымасці працягваць работу, бо адрываюць ад працы штодзённыя клопаты.

Клопатаў гэтых было сапраўды шмат. Цяжка нават уявіць сабе, як мог 67-гадовы чалавек весці такую напружаную працу. У лісце чытаем: «Але гэта не галоўнае, чаму я спыніўся. Так ці інакш — я б справу адолеў. Але ў мяне няма ні часу, ні духоўнага спакою, якія неабходны, каб вызваліцца ад бягучага жыцця, паглыбіцца цалкам у мінулае. Я яшчэ служу, і я тое, што ў нас называюць «актыўны работнік», і — пахвалюся — па секцыі навуковых работнікаў я займаю першае месца па колькасці выступленняў па грамадскай лініі: у 1927 годзе я 192 разы выступіў. Вы можаце сабе ўявіць, што гэта за мітусня! Гэта ж часцей, чым праз дзень. Тут ужо не да пісання! Тым не менш я здолеў здаць некалькі буйных работ. Зараз працую над даследаваннем для зборніка Беларускай Акадэміі навук... Праца мае загаловак: «Да пытання аб этналогіі беларускага народа». Гэта вопыт уводзін у этналогію і этнаграфію беларусаў. Ахоп шырокі. Я прыцягваю матэрыялы археалагічныя і антрапалагічныя, пачынаючы ад 2-га міжледніковага перыяду, матэрыялы лінгвістычныя аб прарадзіме арыйцаў, славян і русаў, гістарычныя, пачынаючы з Герадота, харэаграфічныя ў самым шырокім памеры і антрапалагічныя сучасныя. Працую над гэтым пытаннем ужо даўно, але апошнія тры тыдні, карыстаючыся адпачынкам, я пісаў не разгінаючыся па 12—14 гадзін у суткі».

Сапраўды, выключная працаздольнасць для пажылога чалавека! Не дзіва, што Максім Горкі, які асабіста ведаў Адама Ягоравіча па Ніжняму Ноўгараду, захапляўся неўтаймаванай яго энергіяй. У лісце з Сарэнта ад 16 чэрвеня 1930 года М. Горкі пісаў А. Багдановічу: «Заўсёды мяне вабіла нястрымнасць энергіі Вашай, і — разумееце — рады я ведаць, што гэта энергія не згасла. Вядома Вам, што быў і ёсць я чалавекапаклоннік, буду такім да канца дзён і што Чалавек для мяне перш за ўсё арганізатар свету. Вось гэта самая якасць арганізатара заўсёды захапляла і захапляе мяне ў Вас, васпан!..»

Нягледзячы на вялікую адоранасць і выключную энергію Адама Ягоравіча, даставался яму ўсё цяжка. Трагічна склалася асабістае жыццё яго: зусім маладымі паміраюць яго першая і другая жонкі. Пайшлі з жыцця адзін за адным яго дзеці — маленькая дачка Ніна і сем сыноў. З дзесяці дзяцей перажылі бацьку толькі два: Павел і Мікалай. Успаміны пра сына-паэта Максіма Багдановіча Адам Ягоравіч заканчвае словамі тугі: «І такая недарэчнасць, што не ён пра мяне, а я пра яго павінен пісаць свае ўспаміны».

Шлях у навуку быў для А. Багдановіча таксама трагічным. Ён не быў звязаны з навуковымі ўстановамі, працаваў самастойна. Не ўбачылі свету самыя буйныя працы вучонага: «Язык земли: образование водоречных имен и производного от них» (т. 1—2), «Этнический состав народов славянских и русских» (т. 1—2), «Этнический состав белорусского народа», а таксама ўспаміны «Революционное движение в городе Минске и губернии в 80-х и начале 90-х гг.», «К истории партии «Народной воли» в Минске и в Белоруссии, 1880—1882», «Мои воспоминания» (пра быт і культуру беларускіх сялян) (т. 1—2). Успаміны пра Ф. Шаляпіна, а таксама пра К. Пешкаву засталіся да гэтага часу ў рукапісах. Яны захоўваюцца ў Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР і ў Архіве Максіма Горкага ў Маскве (успаміны пра Пешкаву). Тут знаходзяцца і пісьмы Адама Ягоравіча да Кацярыны Пешкавай.

Толькі вялікая ўпэўненасць у карысці сваіх навуковых выводаў давала сілы не пакладаючы рук працаваць і працягваць даследаванні, нягледзячы на тое, што яны не публікаваліся.

У пісьме А. Луцкевічу ад 7 студзеня 1929 года Адам Ягоравіч пісаў: «А я заўсёды за грамадскімі справамі забываў сябе». Пры такой напружанай службовай, грамадскай і навуковай рабоце Адам Ягоравіч не меў магчымасці асабліва ўваходзіць у справы сваіх сыноў. Ва ўспамінах пра Максіма Багдановіча ён пісаў: «Бацькі, наогул кажучы, дрэнныя суддзі для сваіх дзяцей, і я ў тым ліку».

Любімым сынам Адама Ягоравіча быў трэці сын, Леў, які быў надзелены вялікімі матэматычнымі здольнасцямі. Яго ён адправіў вучыцца ў Маскоўскі універсітэт. Літаратурнай дзейнасці другога сына, Максіма, бацька спачатку, відаць, не надаваў сур'ёзнага значэння. З бацькавых пісем рознага часу мы бачым, як з гадамі, ужо пасля смерці Максіма, Адам Ягоравіч перачытваў літаратурную спадчыну сына і з кожным годам усё больш пранікаўся павагай да яго працы і таленту.

Нямала, відаць, перадумаў бацька над рукапісамі сына. Ужо ва ўспамінах, напісаных у 1923 годзе, ён называе працу сына велізарнай. Разбіраючы архіў, Адам Ягоравіч убачыў тое, чаго не заўважыў у штодзённым жыцці з сынам: самаадданую творчую працу на карысць радзімы, нават дзёрзкую, як скажа ён пазней. У лісце да А. Луцкевіча ад 25 мая 1927 года ён паведамляе адрасату, што днямі выходзіць з друку першы том твораў Максіма Багдановіча ў выданні Інстытута беларускай культуры: «І гэта самае важнае, гэта можна і патрэбна было зрабіць для памяці нябожчыка, які непадзельна аддаў сваё кароткае жыццё паэтычнаму служэнню сваёй радзіме, свайму народу. Гэта было ахвярнае служэнне, род асуджанасці — і ў гэтых адносінах ён рэдкі прыклад: яго вершы сапраўды выпакутаваныя вершы.

Зразумела, не ўсё, што ім напісана, трапіла ў друк, але ўсё ж досыць поўнай будзе кніга яго пакут. Наўрад ці я дачакаюся другога выдання (яго паэзія далёка не ў духу сучасных настрояў) і таму рад, што нарэшце гэта выданне здзяйсняюць».

Падкрэсліваючы трагічнасць асабістага лёсу і ахвярны характар дзейнасці сына, Адам Ягоравіч, аднак, у той час яшчэ не зразумеў велічы паэтычнай спадчыны Максіма Багдановіча. За трагічным лёсам сына ён не ўбачыў яго светлай, аптымістычнай, жыццесцвярджальнай паэзіі, якой суджана доўгае жыццё. Называў паэзію паэта несугучнай нашаму часу. Таму і не было ў думках бацькі ўпэўненасці ў шчаслівым лёсе кніг Максіма. У 1927 годзе Адам Ягоравіч не спадзяваўся на наступныя выданні, мабыць, нават не ведаў, што ўжо ў 20-х гадах вершы Максіма Багдановіча вывучалі ў беларускіх школах.

У 1940 годзе выйшла першая кніга М. Багдановіча ў перакладзе на рускую мову. Аб падрыхтоўцы рускага выдання Адам Ягоравіч ведаў. Прачытаўшы ў «Литературной газете» (№ 54 за 1939 год) артыкул Я. Мазалькова «Замечательный белорусский поэт», Адам Ягоравіч напісаў Яўгенію Мазалькову. Пісьмо датавана 6 студзеня 1940 года, а 16 красавіка 1940 года яго не стала. Відаць, гэта былі апошнія думкі Адама Ягоравіча пра сына Максіма, выказаныя пісьмова.

Але пры жыцці сына-паэта Адам Ягоравіч не верыў у карысць яго справы. Ён не верыў у тое, што мову і культуру беларускага народа можна развіць. У сваёй кнізе «Пережитки древнего миросозерцания у белорусов» (Гродна, 1895) ён пісаў: «...Жыццё беларуса і яго творчая дзейнасць носяць выразны адбітак неразвітасці, адсталасці, забітасці».

Максім Багдановіч усю сваю творчую дзейнасць прысвяціў таму, каб наблізіць час, калі беларуская літаратура ўнясе свой уклад у скарбніцу сусветнай культуры. «Наша пісьменнасць... вялікім пачуццём напоўнена... не на грашовых справах трымаецца яна і ніколі не пойдзе чысціць боты капіталу»,— пісаў паэт.

Адам Ягоравіч не перашкаджаў працы сына-паэта, але і не верыў у яе поспех. І да канца свайго жыцця не зразумеў ён ролі свайго сына Максіма ў развіцці беларускай літаратуры і літаратуразнаўства.

Адам Багдановіч быў чалавекам выключнай волі і жыццяздольнасці. Ні смерць дзяцей, ні тое, што яму не ўдавалася апублікаваць свае навуковыя працы, не зламалі яго, не згасілі яго творчай навуковай энергіі.

Ён працаваў да апошняга дня свайго жыцця. Заключнай яго работай былі ўспаміны аб мінулым жыцці беларускага народа, аб мінулым сваіх продкаў. Пісаў гэтыя ўспаміны для нашчадкаў. Адам Ягоравіч памёр, не дачакаўшыся публікацыі сваіх асноўных прац. Але ён быў сапраўдным вучоным свайго часу.

Ніна ВАТАЦЫ.

